# У ЛЮБАНЬ, ШЛЯХАМІ МАКАЁНКА

**Нашы вандроўкі з паэткай Аксанай Спрынчан, якая кожны год у гэтую пару наведвае Лунінецкі раён, мусяць атрымаць статус традыцыйных. Сёлета ў адзін са жнівеньскіх дзён мы апынуліся ў вёсцы Любань.**

Ад былой велічы і славы некалі заможнага калгаса амаль нічога не засталося. Хоць у свой час вёска і атрымала статус аграгарадка, але з кожным годам сітуацыя пагаршаецца. Аб гэтым распавядаюць мясцовыя жыхары. Мабыць, першым паказчыкам заняпаду з'яўляецца наяўнасць вялікай колькасці нежылых дамоў. Некаторыя хаты, хоць і пустыя, але дагледжаныя, бо выкарыстоўваюцца як лецішчы для тых, хто жыве ў Лунінцы ці ў Мікашэвічах.

Напачатку вандроўкі ў Любань мы наведалі Сцяпана Паўлавіча і Вольгу Якаўлеўну Нефідовічаў. Гасцінныя гаспадары пачаставалі духмянай гарбатай. А яшчэ Сцяпан Паўлавіч зладзіў сапраўдны канцэрт - паказаў гасцям тыповыя для Любані песні, граў на губным гармоніку і акардэоне. Пасля хваробы Сцяпану Паўлавічу цяжка даецца кожны рух, але ж старэнькі "Weltmeister" усё ж выдаваў патрэбныя ноты ва ўмелых руках музыкі. Аксана з дачкой Альжбэтай былі літаральна зачараваны спевамі. Паэтка нават папрасіла тэксты пачутых песень, каб паказаць іх знаёмым сталічным выканаўцам.

Потым мы накіраваліся ў вандроўку, дзеля якой і прыехалі сюды. А пачалася яна літаральна ад дома Нефідовічаў, бо жывуць яны на вуліцы Сцепчанкі. Уладзімір Апанасавіч Сцепчанка - старшыня калгаса "Новае Палессе", Герой Сацыялістычнай Працы. У часы ягонага кіраўніцтва калгас быў у ліку найлепшых. Адукаваны і інтэлігентны чалавек сябраваў з многімі літаратарамі, шмат хто з іх, а таксама многія людзі мастацтва пабывалі тады ў Любані. Але ж самым адметным было сяброўства з народным пісьменнікам, славутым драматургам Андрэем Ягоравічам Макаёнкам. Старшыня Сцепчанка стаў прататыпам героя п'есы Макаёнка "Таблетку пад язык".

На вуліцы Сцепчанкі ў Любані захаваўся дыхтоўны дом, у якім некалі жыў славуты старшыня. А на будынку мясцовага Дома культуры маецца мемарыяльная дошка з выявамі Сцепчанкі і Макаёнка. Некалі на сцэне гэтай установы выступалі артысты Купалаўскага тэатра, праходзілі канцэрты і творчыя сустрэчы з рознымі славутымі людзьмі, што наведвалі Любань.

Побач з ДК - парк. На вялікі жаль, ён вельмі занядбаны і неахайны. Мясцовыя жыхары скардзяцца, што парк зарос хмызняком. Побач з вуліцай той хмыз "спалілі" гербіцыдамі, але ж ад гэтага ён не стаў прыгажэйшы. Некалі за паркам быў замацаваны чалавек, які займаўся ягоным доглядам. Цяпер усё па-іншаму, а прычына адна - няма грошай. Між тым у парку ёсць некалькі экзатычных дрэў. Але галоўнае, што дубы, клёны, бярозы ды ясені пасаджаны тут самім Сцепчанкам, а таксама Андрэем Макаёнкам, Іванам Шамякіным, Піменам Панчанкам ды іншымі славутымі людзьмі. Гэтае месца варта падтрымліваць у парадку і чысціні, дагледзець як след, а яшчэ не лішнімі былі б адмысловыя шыльдачкі: што гэта за дрэва і хто яго пасадзіў.

Добрае ўражанне ад школы. Вялізны і светлы трохпавярховы будынак уражвае. Некалі тут займалася вялікая колькасць вучняў. Цяпер жа школа аб'ядналася з дзіцячым садам. У школе цудоўны музей, які быў створаны настаўнікамі і краязнаўцамі. Экспазіцыя разнастайная і цікавая. Пад яе аддадзены школьныя калідоры. Атрымліваецца, што вучні ўвесь час знаходзяцца ў гэтым асяродку, бачаць экспанаты і стэнды. Хочаш - ня хочаш, але цікавяцца гісторыяй роднага краю. Музей добры, але ж варта было б стварыць нейкі асобны куточак ці стэнд пра людзей, што наведвалі Любань. Не кожны населены пункт раёна можа пахваліцца колькасцю знакамітых людзей, што пабывалі тут, паэтаў і пісьменнікаў, з якіх як мінімум тры мелі званне народных. Спадзяемся, што педагагічны калектыў папрацуе над нашай прапановай...

Зноў крочым па вуліцах Любані. Людзі шчыруюць на агародах - капаюць бульбу. У садах голле яблынь гнецца долу ад вялікага ўраджаю. Усе сустрэчныя вітаюцца. Нехта па-руску: "Здравствуйте", але большасць кажуць: "Добры дзень". А дзень і сапраўды добры.

Гарачыня, і мы крыху стаміліся. Але вада, што чэрпаем са студні на падворку Нефідовічаў, прыдае сіл і жадання прыязджаць у гэтую вёску зноў.

**Мікалай Ільючык, «ІП». Фота аўтара**



**Дом, у якім жыў славуты старшыня на вуліцы, што цяпер носіць яго імя**







Школа ў Любані



У гэтым будынку некалі віравала культурнае жыццё рэспубліканскага маштабу